# ФАЛЬКЛОР У НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ

***В. Л. Гуцько,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Разуменне катэгорыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сучасным кантэксце развіцця соцыума дадае шмат новых азначэнняў да сучаснага ўяўлення пра стан беларускага грамадства. Захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны стала адным з самых набалелых і вострых пытанняў у дзейнасці фалькларыстаў і людзей, неабыякавых да лёсу традыцыйнай беларускай культуры. Нематэрыяльная культурная спадчына адпавядае не толькі народнаму эпасу, традыцыям і рытуалам сямейна-абрадавага і земляробчага календарнага цыкла, але і разнастайным формам матэрыяльнага прадметнага свету, створанага ў побытавых умовах (адзенне, культавыя і штодзённыя рэчы, прылады працы, звязаныя з іх вырабам). Да нематэрыяльнай культурнай спадчыны можна далучыць прыгатаванне ежы, апрацоўку глебы і земляробчай прадукцыі, традыцыйнае будаўніцтва і інш.

Галоўны акцэнт неабходна зрабіць на носьбітах фальклорнай традыцыі, якія прызнаны найвялікшай каштоўнасцю нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Праблема змяншэння колькасці вясковага насельніцтва Беларусі і кардынальныя змены ў вясковым побыце паставілі пытанне аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны больш радыкальна. Носьбіты, якія захоўвалі і дасканала ведалі традыцыю, паступова адыходзяць, іх месца ў трансляцыі традыцыйнай культуры павінны заняць нашчадкі, якія маюць жаданне і магчымасць жыць і працаваць ва ўмовах традыцыйнага побыту.

Праведзеныя новыя даследаванні разумення нематэрыяльнай культурнай спадчыны дапамогуць больш грунтоўна ўсвядоміць яе сутнасць. Менавіта нематэрыяльная культурная спадчына ляжыць у аснове нацыянальнай культуры, яна палягае не толькі ў разуменні традыцый і імкненні іх распаўсюджваць, але нематэрыяльная культурная спадчына можа стаць грунтам структуравання і выяўлення асаблівасцей, якія скла-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даюцца не толькі з фальклорных вызначэнняў, але і традыцый, якія існуюць у нацыянальнай супольнасці неўсвядомлена.

8–9 красавіка 2021 г. адбылася VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі». На пленарным паседжанні «Нематэрыяльная культурная спадчына як турыстычная дэстынацыя: метадалагічныя і этнічныя падыходы» А. Б. Сташкевіч [5] у сваім дакладзе падкрэсліла, што «нематэрыяльная культурная спадчына – гэта новая парадыгма, якая заяўляе аб ахове так званай «жывой» спадчыны. Яна ўсведамляе звычаі, формы ўяўлення і праўялення, веды і вопыт, таксама звязаныя з імі артэфакты, прылады і культурныя прасторы, якія перадаюцца ад папярэдніх пакаленняў да сучаснікаў, могуць змяняцца, пастаянна эвалюцыянуюць, але застаюцца маркёрам ідэнтычнасці для вызначэння супольнасці». Даследчыца адзначыла, што ў нематэрыяльнай культурнай спадчыны вельмі часта адсутнічае сувязь з дакладным месцам, яна можа распаўсюджвацца на вялікіх тэрыторыях ці сустракацца разгрупавана, можа заставацца лакалізаванай і існаваць у звычайных (традыцыйных) межах. Для новага вызначэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны каштоўнасць уяўляюць носьбіты традыцыі. Менавіта этнафоры (носьбіты культуры) маюць магчымасць трансліраваць веды і светапогляд, дзейнічаць у межах партнёрскіх стасункаў для развіцця і захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Носьбіты традыцыйнай беларускай культуры неўсвядомлена ўзнаўляюць нематэрыяльную культурную спадчыну. Падобны механізм трансмісіі існаваў пры канцы XIX – пачатку XX ст., калі этнографы-даследчыкі Паўднёва-Заходняга краю пісалі аб знікненні традыцыйнай культуры беларусаў і немагчымасці яе захавання. Зараз, у XXI ст., адбываецца тыповая сітуацыя – этнографы і даследчыкі традыцыйнай культуры прыкладаюць намаганні дзеля захавання традыцыйнай спадчыны, але самы верны спосаб яе трансляцыі – гэта ўзнаўленне спадчыны носьбітамі культурнай традыцыі, якія выкарыстоўваюць яе ў сваім асяроддзі. Даследчык-культуролаг А. Д. Крывалап у дакладзе «Нацыянальная культура: прастора і змест ці сродак і мэта» [5] на пленарным паседжанні ўжо названай VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі праз спасылку на цытату этно-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графа Франца Фэнана ў манаграфіі 1961 г. «The Wretched of the Earth» («Няшчасныя Зямлі»): «Нацыянальная культура – гэта цэлы комплекс намаганняў людзей, накіраваных на апісанне, апраўданне і ўхваленне дзеянняў, якімі народ стварыў сябе і падтрымлівае ўласнае існаванне», выказаў меркаванне, што нацыянальная культура мае значна большую непахісную сутнасць, чым толькі падтрымка і захаванне фальклору. Яшчэ адзін прыклад неўсвядомленага спасціжэння этнічнай спадчыны можна ўзгадаць у аўтабіяграфічным мастацкім творы нашага сучасніка А. Горвата «Радзіва Прудок», дзе аўтар узгадвае свайго пастарэлага бацьку і заўважае, што пачынае быць падобным на яго нават у рухах і звычках. Вядома, этнічныя характарыстыкі праяўляюцца не адразу ад нараджэння чалавека, а паступова, з наступленнем сталасці, калі этнафоры пачынаюць адчуваць сябе ва ўзросце сваіх бацькоў. Гэты архетыпічны вобраз можна назваць архетыпам «старога бацькі». Таму можна выказаць думку, што этнафоры ў сталым узросце неўсвядомлена будуць узгадваць меркаванні, думкі, дзеянні і рухі, блізкія да трансляцыі старажытнай культуры свайго этнасу.

Расійская даследчыца этнічнай культуры, прафесар Л. М. Лазарава атаясамлівае разгледжаны намі феномен вобразу «старога бацькі» з тэрмінам «культура памяці». Людміла Мікалаеўна вызначае яго як «сховішча ментальных каштоўнасцей, назапашаных пасля гістарычнага фільтравання, як шчыльную субстанцыю з узнаўленнем не толькі прадметнай вобразнай асэнсаванасці, але і эмацыянальнай памяці» [2, с. 436]. Такім чынам, патрэба трансляцыі традыцый культуры будзе суправаджаць жыццядзейнасць этнафораў пастаянна.

Пазіцыя аб тым, што нацыянальная культура не ўяўляецца толькі сукупнасцю ведаў, якія магчыма перадаць па спадчыне, раскрываецца ў працы С. У. Лур’е [3], дзе разглядаецца этнічная культура на аснове ядра культуры (этнічнай карціны свету), якое складаецца з уяўленняў этнасу аб канцавосях дабра і зла, міфаў пра залаты час і шлях перамогі дабра над злом. На падставе азначанай пазіцыі фальклор, вызначаны як частка нематэрыяльнай культурнай спадчыны, можна сістэматызаваць па семіятычных катэгорыях, прыведзеных у працы этнапсіхолага С. У. Лур’е. Для даследчыкаў важна ведаць эпас дзеля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасці не толькі трансляцыі яго зместу наступным пакаленням, але і для разумення пазіцыі і стаўлення этнафораў да навакольнага свету і падзей, якія ў ім адбываюцца.

Другі пункт гледжання на ролю і месца фальклору ў нематэрыяльнай культурнай спадчыне, не менш значны, як і папярэдні, – выяўленне формаў фальклорнай традыцыі ў сучасным бытаванні, якія прадугледжваюць:

– аўтэнтычны фальклор. Існуе ў побытавым асяроддзі і неўсвядомлена праяўляецца ў думках і паводзінах носьбітаў традыцыі;

– другасны фальклор як тып фальклярызму. Узнаўляецца этнафорамі ці ўдзельнікамі прадстаўлення ў штучных умовах для дэманстрацыі традыцыі гледачам. Паводле меркавання беларускага фалькларыста, музыкі і прафесара А. М. Аляхновіча, «у другасным фальклоры адбываецца пераасэнсаванне традыцыі ў форме яе рэстаўрацыі, рэканструкцыі ці стылізацыі» [1, с. 105].

Для трансляцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны характэрна выкарыстанне другаснага фальклору, паколькі аўтэнтычны фальклор існуе ў самастойным, незалежным і непадпарадкаваным стане.

Формы другаснага фальклору (фальклярызму) атаясамліваюцца з рэстаўрацыяй, рэканструкцыяй і стылізацыяй традыцыі ў штучных умовах прэзентацыі ці відовішча. Яны маюць магчымасць перадаць сэнс вонкавых асаблівасцей беларускай нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Узнаўленне (наследаванне) нематэрыяльнай культурнай спадчыны аўтэнтычнага фальклору прадугледжвае «жывое» бытаванне традыцый, якія існуюць у сем'ях, лакалізаваных рэгіёнах ці распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі краіны. Сацыядынаміка формаў аўтэнтычнага фальклору носьбітаў традыцыі ад пакалення да пакалення «акумулюе сацыяльна значныя фальклорныя формы, падкрэслівае зменлівасць фальклорных з'яў: трансфармацыю ўзроўню сацыяльнай актуальнасці, фармальных рысаў і семантычных вызначэнняў, рэгуляцыю разнастайнасці, мадэрнізацыі, паліфармізму» [4, с. 139].

Такім чынам, формы другаснага фальклору павінны быць глыбей і дакладней распрацаваныя даследчыкамі, яго выканаўцы мусяць разумець сімволіку і каштоўнасныя, глыбін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя напластаванні, каб другасны фальклор у рэстаўрававанай, рэканструяванай ці стылізаванай формах не пераўтварыўся толькі ў забаўляльныя выступленні, а выклікаў фундаментальнае разуменне нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў выканаўцаў і гледачоў фальклорных відовішчаў.

1. *Аляхновіч, А. М.* Методыка работы рэжысёра з фальклорнымі калектывамі / А. М. Аляхновіч // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманні : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2010 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2010. – С. 104–105.

2. *Лазарева, Л. Н.* Традиционная праздничная культура как культура национальной и этнической памяти / Л. Н. Лазарева // VII Лазаревские чтения «Лики традиционной культуры в современном культурном пространстве: полифония и диалог смыслов» : материалы Междунар. науч. конф. Челябинск, 3–6 июня 2015 г. / Челяб. гос. акад. культуры и искусств ; сост. Л. Н. Лазарева. – Челябинск : ЧГАКИ, 2015. – С. 434–438.

3. *Лурье, С. В.* Историческая этнология : учеб. пособие для вузов / С. В. Лурье. – М. : Акад. Проект : Гаудеамус, 2004. – 624 с.

4. *Морозов, А. В.* Роль образовательных учреждений в сохранении и популяризации традиционного фольклора (на примере высших учебных заведений Республики Беларусь) / А. В. Морозов // VIII Лазаревские чтения «Лики традиционной культуры в современном культурном пространстве: ренессанс базовых ценностей» : сб. материалов Междунар. науч. конф. Челябинск, 27–28 февр. 2018 г. : в 2 ч. / М-во культуры Челяб. обл., М-во образования и науки Челяб. обл., Челяб. гос. ин-т культуры, Южно-Урал. гос. гуманит.-пед. ун-т, Челяб. гос. ун-т, Челяб. гос. центр народного творчества ; сост. Л. Н. Лазарева. – Челябинск : ЧГИК, 2018. – Ч. II. – С. 138–140.

5. VI Междунар. науч.-практ. конф. «Национальные культуры в межкультурной коммуникации» (8–9 апр. 2021 г.) : программа [Электронный ресурс] / М-во образования Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, фак. социокультурных коммуникаций, кафедра культурологии. – Минск, 2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ